# ПАРК СКАРАЕ СЭРЦЫ ГАРАДЖАН

Мінчане абжываюць новы парк каля будынка Нацыянальнай бібліятэкі, дакладней толькі першую яго чаргу. Нічога дзіўнага — да добрага прывыкаюць хутка. Тут сапраўды ўсё зроблена па вышэйшаму разраду — і ландшафты, і набярэжная, і фантаны, і сяцільні, і лаўкі, і сцежачкі... Сюды імкнуцца і старыя і малады — пахадзіць, пасядзець, паглядзець, палюбавацца. Праўда, зелені пакуль малавата, але будаўнікам удалося захаваць многія з дарослых дрэў, якія раслі тут раней (да закладкі парку тут былі дамы прыватнага сектара з садамі). Пасаджаны і маладыя каштаны, ліпкі, клёны.

Парк будзе расшырацца па накірунку Сляпянкі ўздоўж рукатворнай ракі Вілейска-Мінскай воднай сістэмы. Новы зялёны аазіс абяцае стаць адным з самых папулярных у жыхароў беларускай сталіцы месцаў адпачынку.